ЗАЦВЯРДЖАЮ
Дырэктар ДУА “Сярэдняя
школа №87 г. Мінска”
_______ Е. В.Гаражанцава
“___”__________2025

**План работы вучэбна-метадычнага**
**аб’яднання настаўнікаў**
**беларускай мовы і літаратуры**
**ДУА “Сярэдняя школа №87г. Мінска”**
**на 2025/2026 навучальны год**

Старшыня ВМА
настаўнік беларускай
мовы і літаратуры
Гараднік Таццяна Сяргееўна

***Тэма: ”Удасканаленне прафесійнай кампетэнтнасці настаўнікаў па пытаннях фарміравання функцыянальнай пісьменнасці, развіцця і выхавання асобы навучэнца сродкамі вучэбнага прадмета “Беларуская мова ”і “Беларуская літаратура”***

**Мэта:** удасканаленне прафесійнай кампетэнтнасці настаўніка па пытаннях фарміравання функцыянальнай адукаванасці вучняў сродкамі вучэбнага прадмета “Беларуская мова ”і “Беларуская літаратура” ў 2025/2026 навучальным годзе

**Задачы:**

- інфармаваць настаўнікаў аб нарматыўным прававым, навукова-метадычным забеспячэнні адукацыйнага працэсу па вучэбных прадметах, навінках педагагічнай літаратуры;

- ствараць бяспечныя ўмовы арганізацыі адукацыйнага працэсу на ўроках беларускай мовы і літаратуры;

- фарміраваць функцыянальную адукаванасць вучняў на ўроках беларускай мовы і літаратуры з дапамогай сучасных, у тым ліку інфармацыйна-камп’ютарных, тэхналогій і метадаў навучання (развіццё крытычнага мыслення, «адкрытая прастора», шматмерныя дыдактычныя інструменты, праблемнае навучанне і інш.);

- выкарыстоўваць практыка-арыентаваныя заданні па беларускай мове і літаратуры як сродак фарміравання функцыянальнай адукаванасці вучняў;

- рэалізоўваць выхаваўчы патэнцыял беларускай мовы і літаратуры на ўроках і ў пазакласнай рабоце.

**План**
**правядзення вучэбна- метадычнага аб’яднання настаўнікаў беларускай мовы і літаратуры**
**ДУА “Сярэдняя школа №87 г.Мінска”**
**на 2025-2026 навучальны год**

| **№** | **Тэма** | **Дата** |
|---|---|---|
| 1. | Нарматыўнае прававое і навукова-метадычнае забеспячэнне агульнай сярэдняй адукацыі па вучэбных прадметах “Беларуская мова” і “Беларуская літаратура” ў 2025/2026 навучальным годзе | верасень |
| 2. | Развіццё навыкаў аналітычнай працы з тэкстам на ўроках беларускай мовы і літаратуры для фарміравання эмацыянальнага і сацыяльнага інтэлекту вучняў | лістапад |
| 3. | Праектаванне сучаснага ўрока з пазіцыі сістэмна-дзейнаснага і кампетэнтнаснага падыходаў з выкарыстаннем актыўных і інтэрактыўных метадаў навучання | студзень |
| 4. | Рэалізацыя выхаваўчага патэнцыялу ўрокаў беларускай мовы і літаратуры для фарміравання ў вучняў праз змест вучэбнага матэрыялу сістэмы маральных каштоўнасцей, сацыяльна адобраных паводзін, спосабаў прадуктыўнай камунікацыі | сакавік |
| 5. | Аналіз дзейнасці вучэбна-метадычнага аб’яднання ў 2025/2026 навучальным годзе і перспектывы на 2026/2027 навучальны год | чэрвень |

| | Мерапрыемства | Адказныя |
|---|---|---|
| 1 | *Нарматыўнае прававое і навукова-метадычнае забеспячэнне агульнай сярэдняй адукацыі па вучэбных прадметах “Беларуская мова” і “Беларуская літаратура” ў 2025/2026 навучальным годзе*<br>**Тэрмін правядзення:**верасень<br>**Форма правядзення:** інструктыўна-метадычная нарада<br>**Пытанні:**<br>1.Навукова-метадычнае забеспячэнне вучэбнага працэсу па беларускай мове і літаратуры ва ўстановах агульнай сярэдняй адукацыі ў 2025/2026 навучальным годзе.<br>2.Вучэбна-метадычнае забеспячэнне факультатыўных заняткаў па вучэбных прадметах”Беларуская мова” і “Беларуская літаратура” і асаблівасці іх правядзення.<br>3.Інфармацыйна-метадычная падтрымка адукацыйнага працэсу па вучэбных прадметах “Беларуская мова”, “Беларуская літаратура”:выкарыстанне магчымасцей нацыянальнага адукацыйнага партала пры арганізацыі адукацыйнага працэсу.<br>4.Планаванне работы метадычнага аб’яднання: планаванне работы метадычнага аб’яднання школы на 2025/2026 навучальны год. | Гараднік Т.С.<br>Ярашэўская Н.Г.<br>Дубава А.А.<br>Гараднік Т.С. |
| 2 | *Развіццё навыкаў аналітычнай працы з тэкстам на ўроках беларускай мовы і літаратуры для фарміравання эмацыянальнага і сацыяльнага інтэлекту вучняў*<br>**Тэрмін правядзення:**лістапад<br>**Форма правядзення:** семінар-практыкум<br>**Пытанні:**<br>1. Праектаванне вучэбных заняткаў па беларускай мове і літаратуры з выкарыстаннем сучасных метадаў і сродкаў навучання, розных формаў арганізацыі вучэбнага ўзаемадзеяння, накіраваных на выхаванне і развіццё асобы вучняў.<br>2.Функцыянальныя і змястоўныя магчымасці вучэбных дапаможнікаў і падручнікаў па | Гараднік Т.С.<br>Ярашэўская Н.Г. |

| | | |
|---|---|---|
| | беларускай мове і літаратуры як сродак развіцця чытацкай адукаванасці вучняў.<br>3. Распрацоўка памяткі работы з тэкстам на ўроках беларускай мовы.<br>4. Тэарэтычныя і практычныя аспекты развіцця асобы вучня для фарміравання эмацыянальнага і сацыяльнага інтэлекту.<br>5. Вынікі атэстацыі за 1 чвэрць.<br>6. Падрыхтоўка да ЦЭ і выпускных экзаменаў | Настаўнікі<br><br>Настаўнікі<br><br>Гараднік Т.С., Ярашэўская Н.Г. |
| 3 | *Праектаванне сучаснага ўрока з пазіцыі сістэмна-дзейнаснага і кампетэнтнаснага падыходаў з выкарыстаннем актыўных і інтэрактыўных метадаў навучання*<br>**Тэрмін правядзення:**студзень<br>**Форма правядзення:** семінар<br>**Пытанні:**<br>1.Выкарыстанне лічбавых тэхналогій для арганізацыі адукацыйнага працэсу, у тым ліку тэхналогій штучнага інтэлекту.<br>2. Патрабаванні да сучаснага ўрока, месца і роля<br>актыўных і інтэрактыўных метадаў у фарміраванні сацыяльных і вучэбных кампетэнцый, развіцці інтэлектуальных і творчых здольнасцей навучэнцаў.<br>3. Праектаванне сучаснага ўрока з прымяненнем<br>актыўных і інтэрактыўных метадаў; афармленне электронных прэзентацый, артыкулаў (абмен вопытам).<br>4. Падрыхтоўка да прадметнага тыдня, экзаменаў, ЦЭ, ЦТ.<br>5.Вынікі атэстацыі за 2 чвэрць. | Кухальская А.М.<br>Дубава М.В.<br><br>Настаўнікі<br><br>Настаўнікі<br><br>Ярашэўская Н.Г.,<br>Гараднік Т.С.<br>Настаўнікі |
| 4 | *Рэалізацыя выхаваўчага патэнцыялу ўрокаў беларускай мовы і літаратуры для фарміравання ў вучняў праз змест вучэбнага матэрыялу сістэмы маральных каштоўнасцей, сацыяльна адобраных паводзін, спосабаў прадуктыўнай камунікацыі*<br>**Тэрмін правядзення:**сакавік<br>**Форма правядзення:**семінар-практыкум<br>**Пытанні:**<br>1.Асаблівасці рэалізацыі міжпрадметных сувязей беларускай мовы і літаратуры пры арганізацыі адукацыйнага працэсу. | Кухальская А.Р. |

| | | |
|---|---|---|
| | 2.Абмеркаванне элементаў урокаў беларускай мовы і літаратуры па тэме “Рэалізацыя выхаваўчага патэнцыялу на ўроках”<br>3.Метады і прыёмы для рэалізацыі выхаваўчага патэнцыялу на ўроках беларускай мовы і літаратуры<br>4. Вынікі атэстацыі за 3 чвэрць. | Настаўнікі<br><br>Гараднік Т.С..<br><br>Настаўнікі |
| 5 | *Выніковае пасяджэнне*<br>*Аналіз дзейнасці вучэбна-метадычнага аб’яднання ў 2025/2026 навучальным годзе і перспектывы на 2026/2027 навучальны год*<br>**Тэрмін правядзення:** чэрвень<br>**Форма правядзення:** нарада<br>**Пытанні:**<br>1.Падвядзенне вынікаў прамежкавай атэстацыі вучняў (4 чвэрць), выніковай (2025/2026 навучальны год) атэстацыі вучняў, выпускных экзаменаў.<br>2.Абмен вопытам па пытаннях арганізацыі самаадукацыі.<br>3.Абагульненне, апісанне і прадстаўленне настаўнікамі эфектыўнага вопыту выкладання вучэбных прадметаў “Беларуская мова” і “Беларуская літаратура”.<br>4. Вынікі ўдзелу вучняў у алімпіядным руху, конкурсах, канферэнцыях.<br>5.Падвядзенне вынікаў работы ВМА за навучальны год, вызначэнне перспектыўных напрамкаў работы на наступны навучальны год. | Ярашэўская Н.Г.<br><br>Настаўнікі<br><br>Настаўнікі<br><br>Настаўнікі<br><br>Гараднік Т.С. |

Старшыня ВМА .Т.С. Гараднік

**Пратакол № 1**
**ад 02.09.2025г.**
пасяджэння метадычнага аб’яднання настаўнікаў беларускай мовы і літаратуры
Дзяржаўнай установы адукацыі “Сярэдняя школа №87 г.Мінска”

Кіраўнік Ш**МА** – Т.С. Гараднік
Колькасць членаў ШМА: 4
Прысутнічалі: 4 чалавекі
Адсутнічалі: 0

**Тэма:** **<u>Нарматыўнае прававое і навукова-метадычнае забеспячэнне агульнай сярэдняй адукацыі па вучэбных прадметах “Беларуская мова” і “Беларуская літаратура” ў 2025/2026 навучальным годзе</u>**

**Павестка дня**

1.Навукова-метадычнае забеспячэнне вучэбнага працэсу па беларускай мове і літаратуры ва ўстановах агульнай сярэдняй адукацыі ў 2025/2026 навучальным годзе.
Інфармацыя Гараднік Т.С.

2.Вучэбна-метадычнае забеспячэнне факультатыўных заняткаў па вучэбных прадметах”Беларуская мова” і “Беларуская літаратура” і асаблівасці іх правядзення.
Інфармацыя Ярашэўская Н.Г.

3.Інфармацыйна-метадычная падтрымка адукацыйнага працэсу па вучэбных прадметах “Беларуская мова”, “Беларуская літаратура”:выкарыстанне магчымасцей нацыянальнага адукацыйнага партала пры арганізацыі адукацыйнага працэсу.
Інфармацыя Дубава А.А.

4.Планаванне работы метадычнага аб’яднання: планаванне работы метадычнага аб’яднання школы на 2025/2026 навучальны год.
Інфармацыя Гараднік Т.С.

**Па першым пытанні СЛУХАЛІ:**

Гараднік Т.С., паведаміла аб тым, што навукова-метадычнае забеспячэнне вучэбнага працэсу па беларускай мове і літаратуры ў 2025/2026 навучальным годзе будзе ажыццяўляцца праз удасканаленне навучальных праграм, распрацоўку вучэбна-метадычных дапаможнікаў і метадычных рэкамендацый, а таксама выкарыстанне сучасных інфармацыйных тэхналогій і дыягностыкі. Асноўныя напрамкі ўключаюць у сябе вывучэнне беларускай мовы і літаратуры ў адпаведнасці з абноўленымі вучэбнымі планамі,

выкарыстанне інтэрактыўных метадаў навучання, а таксама метадычную падтрымку настаўнікаў праз навучальныя семінары, круглыя сталы і кансультацыі. Асноўныя напрамкі навукова-метадычнага забеспячэння: Вучэбныя праграмы: адбудзецца ўкараненне абноўленых вучэбных праграм па беларускай мове і літаратуры, якія будуць улічваць сучасныя тэндэнцыі ў адукацыі і адпавядаць патрабаванням стандартнага навучання. Вучэбна-метадычныя дапаможнікі: распрацоўка і распаўсюджванне новай вучэбнай літаратуры, у тым ліку электронных дадаткаў, вучэбных матэрыялаў для самастойнай працы, а таксама метадычных рэкамендацый для настаўнікаў. Інавацыйныя тэхналогіі: укараненне сучасных інфармацыйных тэхналогій, такіх як адукацыйныя платформы, онлайн-рэсурсы, інтэрактыўныя практыкаванні, для павышэння эфектыўнасці навучання. Метадычная падтрымка: арганізацыя навучальных мерапрыемстваў для настаўнікаў, такіх як навучальныя семінары, круглыя сталы, метадычныя кансультацыі, з мэтай павышэння іх прафесійнай кампетэнтнасці і ўкаранення новых метадаў навучання. Дыягностыка і ацэнка: выкарыстанне сучасных метадаў дыягностыкі і ацэначных працэсаў для вызначэння ўзроўню ведаў навучэнцаў і карэкціроўкі адукацыйнага працэсу.

Па першым пытанні **РАШЫЛІ**:

1.Прыняць інфармацыю да ведама: навацыі ў Кодэксе РБ , нарматыўныя прававыя акты, абноўленыя вучэбныя праграмы і вучэбна-метадычныя комплексы па беларускай мове і літаратуры, метадычныя рэкамендацыі па арганізацыі кантролю і ацэнкі вынікаў вучэбнай дзейнасці вучняў, асаблівасці выкарыстання адзінага інфармацыйна-адукацыйнага рэсурса. Тэрмін выканання: пастаянна

**Па другім пытанні СЛУХАЛІ:**

Ярашэўскую Н.Г., якая паведаміла пра вучэбна-метадычнае забеспячэнне факультатыўных заняткаў па вучэбных прадметах”Беларуская мова” і “Беларуская літаратура” і асаблівасці іх правядзення; пра вучэбныя праграмы факультатыўных заняткаў.

Па другім пытанні **РАШЫЛІ**:

1. Стварыць умовы для развіцця функцыянальнай граматнасці вучняў на факультатыўных занятках і кіравацца ў працы адпаведнымі вучэбнымі праграмамі факультатыўных заняткаў:

5 клас “Грані слова: ад гука да сказа” – Дубава А.А.

7 клас “Шчаслівы беларусам звацца”- Гараднік Т.С.

10 клас “Практыкум па арфаграфмі беларускай мовы”- Ярашэўская Н.Г.

6 клас “Сакрэты словазмянення,словаформаўтварэння”- Кухальская А.Р.

Тэрмін выканання: на працягу навучальнага года.

**Па трэцім пытанні СЛУХАЛІ:**

Дубаву А.А. якая паведаміла пра інфармацыйна-метадычную падтрымку адукацыйнага працэсу па вучэбных прадметах “Беларуская мова”, “Беларуская літаратура”:выкарыстанне магчымасцей нацыянальнага адукацыйнага партала пры арганізацыі адукацыйнага працэсу. Выступіла з напамінам пра стварэнне ўмоў пры арганізацыі адукацыйнага працэсу;

выкарыстанне выхаваўчага матэрыялу ўрокаў на працягу навучальнага года; рэалізацыю міжпрадметных сувязей на ўроках беларускай мовы.

Па трэцім пытанні **РАШЫЛІ**:

1. Прыняць інфармацыю да ведама, звяртацца да адукацыйнага партала за інфармацыйна-метадычнай падтрымкай пры арганізацыі вучэбнага працэсу.
2. Тэрмін выканання: на працягу навучальнага года.

**Па чацвёртым пытанні СЛУХАЛІ:**

Гараднік Т.С. з планаваннем работы метадычнага аб'яднання школы на 2025/2026 навучальны год.

Па чацвёртым пытанні **РАШЫЛІ:**

1. Прыняць інфармацыю да ведама, працаваць па плане правядзення вучэбна- метадычнага аб'яднання настаўнікаў беларускай мовы і літаратуры ДУА "Сярэдняя школа №87 г.Мінска.

Тэрмін выканання: на працягу навучальнага года.

Старшыня ВМА Гараднік Т.С.

Сакратар Дубава А.А.

**Пратакол № 2**
**ад 10.11.2025г.**
пасяджэння метадычнага аб’яднання настаўнікаў беларускай мовы і літаратуры
Дзяржаўнай установы адукацыі “Сярэдняя школа №87 г.Мінска”

Кіраўнік **ШМА** – Т.С. Гараднік
Колькасць членаў ШМА: 4
Прысутнічалі: 4 чалавекі
Адсутнічалі: 0

**Тэма:** **<u>Развіццё навыкаў аналітычнай працы з тэкстам на ўроках беларускай мовы і літаратуры для фарміравання эмацыянальнага і сацыяльнага інтэлекту вучняў</u>**

**Павестка дня**

1. Праектаванне вучэбных заняткаў па беларускай мове і літаратуры з выкарыстаннем сучасных метадаў і сродкаў навучання, розных формаў арганізацыі вучэбнага ўзаемадзеяння, накіраваных на выхаванне і развіццё асобы вучняў.

Інфармацыя Гараднік Т.С.

2.Функцыянальныя і змястоўныя магчымасці вучэбных дапаможнікаў і падручнікаў па беларускай мове і літаратуры як сродак развіцця чытацкай адукаванасці вучняў. Сучасныя падыходы да арганізацыі праверкі дамашняга задання.

Інфармацыя Ярашэўская Н.Г.

3. Распрацоўка памяткі работы з тэкстам на ўроках беларускай мовы.

Інфармацыя настаўнікі

4. Тэарэтычныя і практычныя аспекты развіцця асобы вучня для фарміравання эмацыянальнага і сацыяльнага інтэлекту.

Інфармацыя настаўнікі

5. Вынікі атэстацыі за 1 чвэрць, алімпіядны рух

Інфармацыя настаўнікі

6. Падрыхтоўка да ЦЭ і выпускных экзаменаў.

Інфармацыя Ярашэўская Н.Г.,
Гараднік Т.С.

**Па першым пытанні СЛУХАЛІ:**

Гараднік ТС. з дакладам “Вучэбна – пазнавальная дзейнасць вучняў. Роля вучэбных заняткаў і пазаўрочнай работы для актывізацыі і стымулявання вучэбна – пазнавальнай дзейнасці вучняў”, з паведамленнем аб тым, якія

інтэрактыўныя метады и прыёмы можна выкарыстоўваць на вучэбных заняткаў па беларускай мове і літаратуры: “Памяняемся месцамі”, “Падары кветку”, “Гексы”, “Кошык ідэй”, “Альтэрнатыўны тэст”, “Выберы пазіцыю”, “Лагічны ланцужок”, “Прэс-канферэнцыя”, “Алфавіт”, “Алітэрацыя імені”, “Ланцужок пажаданняў”, “Калючае слова”, “Ключавое слова”, “Сінквейн” і інш. Адзначыла, што гэтыя метады і прыёмы з’яўляюцца даволі ўніверсальнымі, не патрабуюць вялікай колькасці нагляднага матэрыялу, пры выкарыстанні інтэрактыўных метадаў ствараецца атмасфера добразычлівасці, фарміруецца станоўчая матывацыя да навучання.

Па першым пытанні **РАШЫЛІ**:

1.Выкарастоўваць на ўроках беларускай мовы і літаратуры інтэрактыўныя метады.

Тэрмін выканання: пастаянна

**Па другім пытанні СЛУХАЛІ:**

Ярашэўскую Н.Г., якая паведаміла пра функцыянальныя магчымасці вучэбных дапаможнікаў: структураванне інфармацыі, падачу матэрыялу ў розных фарматах, інтэрактыўнасць; пра змястоўныя магчымасці вучэбных дапаможнікаў: развіццё крытычнага мыслення, уводзіны ў культурны кантэкст, чытацкую дзейнасць, практычныя заданні; пра выкарыстанне вучэбных дапаможнікаў у навучальным працэсе: інтэграцыю з іншымі прадметамі, развіццё самастойнасці, кіраванне чытацкай дзейнасцю. Адзначыла, што вучэбныя дапаможнікі па беларускай мове і літаратуры з’яўляюцца важным сродкам развіцця чытацкай адукаванасці вучняў; пра сучасныя падыходы да арганізацыі праверкі дамашняга задання.

Па другім пытанні **РАШЫЛІ**:

1. Стварыць умовы для развіцця чытацкай адукаванасці вучняў на ўроках беларускай мовы і літаратуры.

Тэрмін выканання: пастаянна.

**Па трэцім пытанні СЛУХАЛІ:**

Настаўнікаў беларускай мовы і літаратуры, якія падрыхтавалі памяткі работы з тэкстам на ўроках беларускай мовы. Дубава А.А. падрыхтавала памятку з відамі самастойнай работы з тэкстам. Кухальская А.Р. падрыхтавала памятку работы з тэкстам на ўроках беларускай літаратуры. Гараднік Т.С. - “Як аналізаваць тэкст”, Ярашэўская Н.Г. - “Як пісаць сачыненне па тэксце”.

Па трэцім пытанні **РАШЫЛІ**:

1. Выкарастоўваць памяткі пры правядзенні ўрокаў беларускай мовы. Тэрмін выканання: на працягу навучальнага года.

**Па чацвёртым пытанні СЛУХАЛІ:**

Настаўнікаў беларускай мовы і літаратуры, якія прынялі ўдзел у бяседзе “Тэарэтычныя і практычныя аспекты развіцця асобы вучня для фарміравання эмацыянальнага і сацыяльнага інтэлекту”. Правялі дыялог па тэме “Паняцце эмацыянальнага і сацыяльнага інтэлекту”. Настаўнікі. звярнулі ўвагу на тое,

што фарміраванне эмацыянальнага і сацыяльнага інтэлекту ў вучняў з’яўляецца важным аспектам іх гарманічнага развіцця.

Па чацвёртым пытанні **РАШЫЛІ:**

1. Працягнуць фарміраванне маральных каштоўнасцяў: вучні вучацца спачуваць, дапамагаць, прымаць; ствараць умовы для паляпшэння школьнага клімату: менш канфліктаў, больш супрацоўніцтва; наладжваць камунікацыю: вучні становяцца больш адкрытымі, упэўненымі і здольнымі да дыялогу.

Тэрмін выканання: на працягу навучальнага года.

**Па пятым пытанні СЛУХАЛІ:**

Настаўнікаў беларускай мовы і літаратуры , якія агучылі сярэдні бал па класам за 1 чвэрць; настаўнікі падкрэслілі, што ёсць вучні з высокімі дасягненнямі, а таксама тыя, каму патрэбна падтрымка.

Па пятым пытанні **РАШЫЛІ:**

1. Інфармацыю прыняць да ведама.
2. Праводзіць стымулючыя і падтрымліваючыя заняткі. (праца з адоранымі, высокаматываванымі і нізкаматываванымі вучнямі)

Тэрмін выканання: на працягу навучальнага года.

**Па шостым пытанні СЛУХАЛІ:**

Гараднік Т.С. і Ярашэўскую Н.Г., якія паведамілі пра падрыхтоўку да ЦЭ і выпускных экзаменаў.

Па шостым пытанні **РАШЫЛІ:**

1. Інфармацыю прыняць да ведама.

Старшыня ВМА Гараднік Т.С.

Сакратар Дубава А.А.